★

# БУДЗЕМ БУДАВАЦЬ НОВАЕ, РАДАСНАЕ ЖЫЦЦЁ

1939 год я сустракаў у адзіночнай камеры. Разам са мною ў турме, у мястэчку Равіч, сядзелі 700 чалавек, якія змагаліся супроць панскага самаўладства. Гэта была трэцяя гадавіна прабывання ў турме. Прадстаяла быць зняволеным пажыццёва.

Зусім новае жыццё пачалося для мяне з 17 верасня 1939 года, калі ўсім працоўным былой панскай Польшчы была вернута доўгачаканая свабода. З гэтага дня пачаліся ў нас дні радасці і шчасця.

Яшчэ больш радасці нясе нам 1940 год. Поўнасцю будзе ліквідавана беспрацоўе. На прадпрыемствах павялічыцца колькасць змен. Ужо зараз 200 сем'яў рабочых Беластока перасяляюцца з падвалаў у дамы былых фабрыкантаў. У горадзе пачне працаваць першы ў заходніх абласцях БССР педагагічны інстытут. Адкрыюцца новыя бальніцы, санаторыі, дамы адпачынку. Сяляне нашай вобласці праводзяць першую бальшэвіцкую вясну.

Пад кіраўніцтвам нашага вялікага друга і настаўніка таварыша Сталіна мы будзем будаваць у 1940 годзе новае, шчаслівае і радаснае жыццё.

**СЕРГЕЙ ПРЫТЫЦКІ,**
член Паўнамоцнай камісіі Народнага Сабранчя Заходняй Беларусі, нам. старшыні Беластокскага аблвыканкома.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ